Viestki543.qxd 5/1/2011 8:53 PM Page 1 (3,1)



# Весткі й Паведамленьні

**Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня**

**Viestki j Paviedamlenni**

№ 5 (543)
Травень 2011 г.




*Belarusan American Association, Inc.*
*P. O. Box 572, New York, NY 10113-0572*



Сусьветнае сеціва: *www.baza-belarus.org*


# Чарнобыльскі мітынг на Мангэтане

На 25-ю гадавіну Чарнобыльскай трагедыі, 26 красавіка, Нью-Ёрскі аддзел БАЗА правёў мітынг салідарнасьці з ахвярамі Чарнобыля і адначасна мітынг пратэсту супраць палітыкі рэжыму Лукашэнкі ў дачыненьні да насельніцтва забруджаных радыяцыяй тэрыторыяў і ліквідатараў, а таксама ў дачыненьні да будаўніцтва АЭС у Беларусі.

Удзельнікі мітынгу сабраліся на Першай авэню ў Мангэтане насупраць будынка штабкватэры Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў. Старшыня Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА Віталь

***Заканчэньне на бачыне 4***




# КУПАЛЬЛЕ

**Шаноўныя сябры-беларусы!**

*Запрашаем разам адзначыць старадаўнюю рамантычную традыцыю КУПАЛЬЛЯ і правесьці незабыўны адпачынак у кампаніі суродзічаў на ўлоньні прыроды. Чароўны купальскі вечар пачнеца з прызначэньня Князя-Купаліша і Купалінкі, якія распаляць вогнішча. Уночы нячысьцікі выкрадуць Купалінку. Каб даведацца пра іншыя падзеі і абрады купальскай ночы, далучайцеся да нас. Пачастуйцеся крупнікам, у склад якога па традыцыі ўваходзяць 27 лекавых траваў. Скокніце праз вогнішча з тым, хто вам не абыякавы, не разьняўшы рук. Можа каму з вас пашанцуе знайсьці сваю папараць-кветку ў гэтую чароўную ноч.*

**Калі:** Сьвята пачнецца ў суботу **18 чэрвеня** прыкладна **а 6-й вечара** і працягнец-ца ўсю самую кароткую ноч году. Дазвол ў парку з 11-й раніцы ў суботу да 11-й раніцы ў панядзелак. Колькасьць удзельнікаў абмежаваная (умовамі парку) да 40 чалавек.

**Дзе:** Парк **Ward Pound Ridge Reservation** у ***Cross River, NY 10518***. Шукайце хаткі 1, 2, 3 і 4.

**Транспарт:** Цягніком са станцыі **Grand Central** да прыпынку **Katonah**, прыкладна, 1 гадзіна часу ў дарозе.

**Кошт:** **$25** дарослым, **$10** дзецям.

**Кантакты:** **Пётр і Лена РЫЖЫЯ,** тэлефон: ***(914) 522-0742***, электронная пошта: ***lenabelarus@yahoo.com***
***Piotr & Lena Ryzy***
***P. O. Box 1952***
***Ossining, NY 10562***

**Мець з сабою:**
- беларускія строі, вышыванкі ці адзеньне з сымболікай; дзяўчатам – доўгія спадніцы, хлопцам – доўгія сьветлыя штаны, ня шторты (толькі на час сьвяткаваньня);
- ежу і ваду, спальныя мяшкі, намёты, раскладныя крэслы, ліхтарыкі;
- **$8** з аўта ў незалежнасьці ад колькасьці пасажыраў за ўезд у парк днём, пасьля 5-й вечара ўезд бясплатны.

Viestki543.qxd 5/1/2011 8:53 PM Page 3 (1,1)



# Красавіцкі сход Нью-Ёрскага аддзелу

У суботу, 9 красавіка, у Доме Маракоў на Мангэтане прайшоў чарговы красавіцкі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка азнаёміў прысутных з падзеямі ў Беларусі за апошні месяц. У прыватнасьці, былі ўзгаданыя суды над удзельнікамі акцыі пратэсту пасьля выбараў, працяг пераcьледу дэмакратычнай апазіцыі, арышты на Дзень Волі, пагаршэньне эканамічнай сытуацыі, зьнікненьне валюты з абменных пунктаў у Беларусі. Прамоўца таксама закрануў Акт аб Дэмакратыі й Грамадзянскіх Правох у Беларусі, што разглядаецца Кангрэсам ЗША і прадугледжвае аднаўленьне шэрагу санкцыяў супраць рэжыму Лукашэнкі. Было паведамлена пра сьвяткаваньне аддзеламі БАЗА ў Нью-Ёрку і Нью-Джэрзі ўгодкаў Акту 25 Сакавіка – Дня Волі ў Нью-Брансўіку, Нью-Джэрзі, якое адбылося 27 сакавіка сёлета.

Сп. Зайка распавёў таксама пра навуковы праект Унівэрсытэту Мінэсоты па вывучэньні дыяспараў у ЗША і прапанаваў увазе прысутных анкеты, што ёсьць часткаю праекту па збору інфармацыі аб беларусах у ЗША.

Сакратар аддзелу сп-ня Валянціна Якімовіч выступіла з дапаўненьнямі пра сьвяткаваньне Дня Волі ў Нью-Брансўіку, а таксама распавяла пра нядаўняе Гуканьне вясны, што адбылося ў мястэчку Осынін, штат Нью-Ёрк, і прайшло згодна з старадаўнімі беларускімі традыцыямі і абрадамі сустрэчы вясны.

Падчас сходу адбылася нязмушаная гутарка пра шляхі і мэтады паляпшэньня працы нашай арганізацыі па прыцягненьні й яднаньні моладзі зь Беларусі, што апынулася ў ЗША. Маладыя людзі й дзяўчаты расказвалі пра сябе, адбыліся знаёмствы з гасьцямі аддзелу.

У канцы сходу прагучалі аб'явы й паведамленьні, жадаючыя мелі магчымасьць далучыцца да сяброўства ў аддзеле, падаўшы заявы аб уступе ў арганізацыю.

**Віталь ЗАЙКА**

# Ганаруся быць беларускаю

Кожны з нас, спадзяюся, мае пачуцьцё сувязі з Радзімаю. Але тут, у Нью-Ёрку, пачуцьцё гэтае часта пачынае губляцца, асабліва, калі побач няма тваіх родных і сяброў з Бацькаўшчыны. У гэтым вялікім горадзе з чужою культураю, музыкаю, моваю і ладам жыцьця, з зусім іншым мэнталітэтам людзей, можна згубіцца і нават забыцца, хто ты такі. Бо, жывучы тут, усё больш пачынаеш размаўляць па-ангельску, а родную мову ўжываеш усё радзей.

Калі цябе нехта пытае: "Хто ты, ці адкуль ты родам ?" – ты, мабыць, адказваеш: "Я – беларус". Але ня кожны ўсьведамляе, што гэта значыць, як не задумвалася і я.

Калі я сустрэлася ў Нью-Ёрку з маім сябрам з Наваполацку Арцёмам Міхайлоўскім, ён параіў мне: "Ідзі да сваіх". І я прыйшла ў аддзел Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Нью-Ёрку.

Прызнаюся сумленна, я й не разумела, наколькі гэта важна сустракацца, сябраваць і размаўляць зь землякамі, абмяркоўваючы палітычныя, эканамічныя і культурныя падзеі, што адбываюцца ў Беларусі і ў сьвеце. Калі ўпершыню прыйшла на сход і пачула, што ўсе размаўляюць па-беларуску, спачатку я спалохалася, што не змагу быць сапраўднаю сяброўкаю арганізацыі, таму што не размаўляю так добра на роднай мове. Прычынаю гэтаму ў тым, што ў Беларусі я саромелася размаўляць па-беларуску, ды й сябры зьдзекваліся, таму што гэта лічылася несучасным і нямодным, а мне не хацелася быць белаю воронаю, над якою ўсе сьмяюцца. Таму родная мова паступова забывалася.

Цяпер я разумею, што на гэта была і ёсьць скіраваная палітыка лукашэнкаўскага ўраду, каб маладыя беларусы нават і не задумваліся, што яны адрозны ад расейцаў народ, які мае сваю адметнаю мову, культуру, традыцыі, урэшце, сваю дзяржаву, за якую трэба змагацца, каб быць гаспадаром у ёй, а не шукаць шчасьця па сьвеце недзе ў чужых краёх.

Трапіўшы ў БАЗА ў беларускамоўнае асяродзьдзе, я перастала саромецца і баяцца, адчула сябе сярод роўных і з радасьцю пачала размаўляць па-беларуску. І мне гэта падабаецца. Гэта дадало мне ўпэўненасьці, што ў гэтай краіне я не адна. Хочацца параіць усім, хто ходзіць на нашыя сходы, каб таксама, спачатку як могуць, як атрымоўваецца, спрабавалі размаўляць між сабою і дома па-беларуску, каб вярнуцца да нашай роднай мовы. Мабыць тады мы будзем адчуваць сябе больш згуртаванымі й абароненымі. Мова аб'ядноўвае людзей.

Больш таго, менавіта ўдалечыні ад Радзімы я пачала адчуваць сваю прывязанасьць да беларускай культуры нават больш, чым раней.

Сяброўкаю БАЗА я стала нядаўна. Даведалася, што сябры арганізацыі адзначаюць тут нашыя нацыянальныя сьвяты: Каляды, Гуканьне вясны, Купальле, сьвяткуюць Дзень незалежнасьці Беларусі, сьмела ацэньваюць палітычныя падзеі і навіны, пра якія даведваюцца не з салодка-ліпавай падачы беларускага тэлебачаньня, а з самых разнастайных інфармацыйных крыніцаў. Адзін мой знаёмы сказаў: "Я хачу жыць ў такой Беларусі, у якой тэлебачаньне будзе працаваць па-беларуску, а не на расейскай мове нашых фактычных акупантаў."

Зь нецярпеньнем чакаю лета і Купальля. Спадзяюся, што сёлета на яго зьбярэцца шмат дзяўчат і хлопцаў. Лета ў Нью-Ёрку горачае, і нашае традыцыйнае народнае сьвята будзе выдатнай нагодаю разам паехаць на прыроду, забыўшыся пра гарадзкія клопаты.

Вельмі задаволеная, што знайшла месца і сяброў, дзе я з годнасьцю магу адчуваць сябе беларускаю.

**Алена АХМЯНЕНКА**

*Рэдакцыя "Вестак і Паведамленьняў" вітае напісаньне чытачамі лістоў з водгукамі, думкамі і прапановамі і з радасьцю будзе старацца пры магчымасьці друкаваць іх.*

*Усе лісты і іншую карэспандэнцыю накіроўвайце ў рэдакцыю на адрасы, пададзеныя на 4-й бачыне.*

Viestki543.qxd 5/1/2011 8:53 PM Page 3 (3,1)



## Беларусь – Амэрыка: лёсы землякоў

# Давід ДУБІНСКІ (1892 - 1982)

### прафсаюзны і грамадзкі дзеяч

*Віталь ЗАЙКА*

Давід Дубінскі (сапраўднае імя Довід-Іцхак Дубнеўскі) нарадзіўся ў Берасьці, восьмым па ліку дзіцём у сям'і пекара. Праз некалькі год пасьля нараджэньня Давіда сям'я перабралася ў пошуках лепшай долі ў Лодзь.

Змалку Давід працаваў у пякарні й разносіў выпечаны хлеб па дробных крамах. Ён атрымаў традыцыйную рэлігійную адукацыю ў хэдары і пайшоў вучыцца далей у гімназію, але потым мусіў кінуць вучобу, каб дапамагаць сваякам у пякарні. Працуючы поруч з старэйшымі, Давід трапіў пад уплыў сацыялістычных ідэяў і агітацыі партыі гэбрайскіх працаўнікоў Бунд. Ён таксама далучыўся да прафсаюзу пекараў і нават зрабіўся праз нейкі час намесьнікам сакратара ў ім. Падчас Першай расейскай рэвалюцыі 1905 г. ён браў удзел у мітынгах і страйках працоўных. Дубінскі ўважаў, што дэмакратычны сацыялізм ёсьць шляхам да лепшага жыцьця, і прыняў Бундаўскае бачаньне ўтопіі, у якой гэбрайскія работнікі будуць квітнець у брятняй сям'і працоўных сьвету. У 1907 г. Дубінскага арыштавалі за спробу арганізацыі страйку пекараў, умовы працы якіх былі, бадай, найгоршымі з усіх.

Бацька выкупіў яго з паліцыі з умовамю, што Давід Дубінскі пакіне Лодзь. Давід перабраўся ў Берасьце, а пасьля працаваў у пякарні ў Кобрыне. Яго цягнула да актыўнай грамадзкай працы, і праз нейкі час ён з падробленым пашпартам вярнуўся ў Лодзь. Адною зь ягоных функцыяў было выведваць праз бацьку аб плянах уласьнікаў пякарняў і паведамляць прафсаюзу. Разам з гэтым Давід змагаўся супраць практыкі махінацыяў і абкраданьня пекарамі сваіх працадаўцаў. У 1908 г. ён быў арыштаваны на выбарчым сходзе прафсаюзу. Дубінскі правёў у турмах Лодзі, варшаўскім Павяку і маскоўскай Бутырцы 18 месяцаў, пазнаёміўшыся з жыцьцём палітзьняволеных і крымінальнікаў. Затым ён быў высланы пад Чалябінск, але здолеў уцячы з высылкі й вярнуцца ў Лодзь. Затым ён з дапамогаю мясцовага Бунду і брата, што жыў у Амэрыцы, нелегальна перайшоў у Нямеччыну і разам з другім сваім братам дабраўся да Антвэрпэну. Адтуль у сьнежні 1910 г. ён выехаў у Амэрыку і напачатку 1911 г. пасяліўся ў Нью-Ёрку на Клінтан стрыт недалёка Мангэтанскага масту. Гэта было на ніжнім Іст-Сайдзе – месцы, дзе звычайна сяліліся гэбрайскія іміграныты з Усходняй Эўропы і Расеі. Давід стаў працаваць у рэстарацыі, а потым апэратарам швей-машыны на адной з фабрыкаў у Брукліне, і, нарэшце, краўцом – тады краўцы лічыліся "элітаю" сярод швейных прафэсіяў.



Калі ў сакавіку 1911 г. у Нью-Ёрку здарыўся пажар на фабрыцы кашуляў "Трохкутнік", дзе праз неадэкватныя ўмовы працы й пажарнай бясьпекі загінулі амаль паўтары сотні чалавек, Дубінскі быў моцна ўзрушаны. Пазьней ён казаў, што гэтая падзея ператварыла яго з "гледача на мітынгах" у актывіста. Дубінскі стаў актыўна ўдзельнічаць у прафсаюзным руху, і ў ліпені 1911 г., праз паўгады па прыезьдзе ў Амэрыку, ён зрабіўся сябрам галіновага прафсаюзу (або галіновай філіі: Local 10) Інтэрнацыянальнага Прафсаюзу работнікаў па жаноцкім адзеньні (І.П.Р.Ж.А., International Ladies' Garment Workers Union, ILGWU). У той час колькасьць сяброў гэтага прафсаюзу, што існуе дасюль, складала ўсяго 2 тысячы чалавек. Але неўзабаве, пасьля некалькіх пасьпяховых страйкаў працаўнікоў швачна-кравецкіх галінаў, а таксама дзеля трагедыі на "Трохкутніку" шэрагі прафсаюзу значна павялічыліся.

У 1912 г. Дубінскі ўступіў у Сацыялістычную партыю. Фракцыйныя закалоты, віраваньне й барацьба розных групаў у партыі сталі для Дубінскага школаю, у якой загартаваўся будучы прафсаюзны лідэр. Другою школаю стала для яго газэта "Форвэртс", якую рэдагаваў Аб Каган, зямляк зь Віленшчыны. Разам з іншымі сацыялістамі й прафсаюзьнікамі Дубінскі браў удзел у прэзыдэнцкай кампаніі Юджына Дэбса ў 1912 г., і падтрымаў прадстаўніка партыі Маера Лёндана ў змаганьні за месца ў Сэнаце. Калі на адным зь мітынгаў не зьявіўся заплянаваны прамоўца, Дубінскі дэбютаваў з выступам да прысутных на ідыш. Неўзабаве Дубінскі ажаніўся і ўзяў традыцыйны гэбрайскі шлюб з удзелам рабіна, не зважаючы на свае сацыялістычныя перакананьні.

Прафсаюз ІПРЖА быў заснаваны ў 1900 г. сацыялістамі, але ён спалучаў у сабе радыкальныя ідэі і кансэрватыўную трэйд-юніянісцкую практыку, і даволі стрымана ставіўся да страйкаў. Дзеля гэтага прафсаюз меў сабе канкурэнтам "Прамысловых Работнікаў Сьвету" (ПРС, Industrial Workers of the World), які ствараў паралельныя філіі прасавальнікаў, вытворцаў палітонаў і хустак. ІПРЖА быў адною з арганізацыяў, сацыяваных з славутай Амэрыканскай Фэдэрацыяй Працы (АФП) Сэмюэла Гомпэрса, нягледзячы на разыходжаньні зь ім адносна стаўленьня да сацыялізму ды іміграцыйнай палітыкі ў ЗША.

Дубінскі атаясамляў сябе з умеркаваным крылом расейскага рэвалюцыйнага руху – зь меншавікамі, што былі хаўрусьнікамі Бунду. Таму Дубінскі не падтрымаў захопу ўлады бальшавікамі й пазьней станоўка выступаў супраць бальшавізму.

У 1920 г. Дубінскі быў абраны дэлегатам на кангрэс ІПРЖА ў Чыкага, а ў канцы таго-ж году быў абраны прэзыдэнтам сваёй філіі. У гэты час адбывалася радыкалізацыя прафруху, рост прабальшавіцкіх настрояў. У ліпені 1920 г. у Маскве быў створаны Прафінтэрн (бальшавіцкі Прафсаюзны Інтэрнацыянал), што меў на мэце падпарадкаваць Саветам прафсаюзныя рухі ў сьвеце. Амэрыканскія камуністы пачалі ўтвараць у прафсаюзах у ЗША прарасейскія фракцыі, т. зв. "левае крыло", каб потым паставіць іх пад кантроль Кампартыі. Менавіта супраць гэтых фракцыяў павёў змаганьне Дубінскі.

У 1922 г. Дубінскі зрабіўся віцэ-прэзесам усяго прафсаюзу ІПРЖА і атрымаў больш мажлівасьцяў як для змаганьня за правы працаўнікоў, так і супрацьстаяньня камуністычным уплывам у прафсаюзах. Камуністы, з падтрымкаю анархістаў і часткі сацыялістаў, сталі набіраць больш уплываў у шэрагу філіяў ІПРЖА, і вымусілі кіраўніцтва прафсаюзу пагадзіцца з іхнай палітыкай і пайсьці на агульны страйк у ліпені 1926 г. Аднак страйк ня меў посьпеху й падтрымкі сярод працаўнікоў, і меў драматычныя наступствы для камуністаў, што былі змушаныя пакінуць кіраўніцтва амаль усіх філіяў.

Набраўшы значны аўтарытэт праз сваю працу як у мясцовай філіі, гэтак і на пасадзе віцэ-прэзеса, Дубінскі працягваў сваё ўзыходжаньне да ўлады ў ІПРЖА, што зрабіўся адным з наймацнейшых і ўплывовейшых прафсаюзаў у Амэрыцы.

*Заканчэньне ў наступным нумары*

## Шаноўнае спадарства!

Нагадваем, што працягваецца збор твораў для літаратурнга альманаху “БЕЛАРУС” за 2011 год, друк якога заплянаваны на жнівень месяц сёлета.

Умовы застаюцца такімі-ж як у папярэднія гады: зьмясьціць свае творы ў выданьні могуць аўтары, хто піша па-беларуску ў самых розных літаратурных жанрах. Адзіная ўмова – аўтары сёньня павінны жыць па-за межамі Беларусі.

Творы найлепш дасылаць у рэдакцыю электроннаю поштаю на адрас: ***hazetabielarus@att.net*** У выключных выпадках, калі аўтары ня маюць доступу да сусьветнага сеціва, творы можна даслаць поштаю запісанымі на CD ці DVD альбо надрукаванымі на паперы на адрас рэдакцыі:

***BIELARUS***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735 USA***

Тэксты пажадана пісаць тарашкевіцай. Творы напісаныя наркамаўкай, у альманаху будуць надрукаваныя тарашкевіцай.

Кожнаму, хто вырашыць даслаць творы для альманаху, пажадана таксама даслаць свой фатаздымак і кароткую аўтабіяграфію і, калі захочуць, дадатковую інфармацыю пра сябе, якую яны хацелі-б паведаміць сваім чытачам.

Апошні тэрмін для дасылкі твораў **31 траўня 2011 году**.

Пасьля выхаду альманаху ў сьвет кожны аўтар атрымае адзін асобнік бескаштоўна. Аўтары пры жаданьні змогуць замовіць дадатковую колькасьць асобнікаў па сабекошту, які будзе паведамлены ім пазьней.

Ганарараў аўтарам рэдакцыя, нажаль, выплочваць ня можа, бо ня ёсьць камэрцыйнаю ўстановаю, а існуе дзякуючы падтрымцы ахвярадаўцаў і чытачоў.

З пытаньнямі кантактуйце рэдакцыю. Жадаем посьпехаў!

*Нагадваем, былыя падпісчыкі газэты “Беларус”, што ахвяравалі свае сродкі на выданьне альманаху ў лістападзе 2010 году, атрымаюць альманах бескаштоўна. Іншыя аматары літаратуры могуць замовіць выданьне ў рэдакцыі.*

Папярэдняя замова разам з дасылкаю ў межах ЗША каштуе **$12,** Вялікабрытанію і Канаду - **$17,** усе іншыя краіны - **$18.**




Жадаючыя могуць замовіць нумары за папярэднія гады. Зрабіць гэта можна, як па пошце, так і наведаўшы старонку **www.e-krama.com** і зрабіўшы аплату крэдытнаю карткаю.

# Чарнобыльскі мітынг

***Заканчэньне з бачыны 1***

Зайка распавёў пра мэты мітынгу і зрабіў агляд сытуацыі з радыёактыўным забруджаньнем і ліквідацыяй яе наступстваў за чвэрць стагодзьдзя. Ён таксама ўзгадаў палітыку рэжыму, у прыватнасьці, нагадаў кольшнія меркаваньні Лукашэнкі пра “бясьпеку пражываньня і чыстыя прадукты” ў чарнобыльскіх раёнах, і адзначыў апошнія ягоныя скандальныя выказваньні, у якіх той у неналежнай для дзяржаўнага дзеяча форме адмовіўся ад міжнароднай дапамогі.

Удзельнікі мітынгу трымалі бел-чырвогна-белыя сьцягі й плякаты “Чарнобыль – 25 год пакутаў”, “Дзьве бяды Беларусі – Лукашэнка і Чарнобыль”, “Беларусі не патрэбны другі Чарнобыль!”. Чуліся лёзунгі: “Беларусь – так! Лукашэнка – не!”, “Далоў Лукашэнку!”, “Жыве Беларусь!”. Мінакам раздавалі ўлёткі з інфармацыяй пра наступствы ядзернай катастрофы ў Беларусі.

На акцыі былі прысутныя журналісты і група расейскамоўнага тэлебачаньня. Акурат у гэты час у штаб-кватэры ААН адбывалася паседжаньне, прысьвечанае трагічнай гадавіне.

**Віталь ЗАЙКА**

### Уплаты ў Нью-Ёрскі аддзел БАЗА

Складкі й ахвяраваньні:

| | |
|---|---|
| С. Арыфуліна | 50 |
| А. Гусак | 50 |
| А. Грошаў | 50 |
| С. Крутаўцоў | 50 |
| В. Крэмез | 50 |
| Н Лашук | 30 |
| Н. Піваварчык | 50 |
| А. Русецкая | 50 |
| М. Цiхановiч | 50 |

**Усім шчыры дзякуй!**

### Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

*Belarusan American Association*
*P. O. Box 572*
*New York, NY 10113*
**Чэкі выпісвайце на**
*Belarusan American Association.*

*Шаноўныя сябры!*
*Калі Вы атрымліваеце бюлетэнь **“Весткі й Паведамленьні”** як сябар Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА, але яшчэ не рабілі ахвяраваньняў на ягонае выданьне, калі ласка, паведаміце рэдакцыі (поштаю ці праз е-мэйл) аб жаданьні атрымліваць бюлетэнь і, па магчымасьці, падтрымайце выданьне фінансава.*

## НАСТУПНЫ СХОД

Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА будзе **справаздачна-выбарчым** і пройдзе **ў суботу, 14-га траўня 2011 г.** Просьба ўсім сябрам аддзелу ўзяць удзел у выбарах новага кіраўніцтва, хто ня зможа асабіста - праз упаўнаважаньне сваіх прадстаўнікоў.

Месца правядзеньня сходу:

***Seafarers and International House***
***123 East 15th Street***
***New York, NY 10003.***

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да станцыі **Union Square**.*

*Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.*

Пачатак сходу: **а 6:00-й** вечара.

-------------------

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА ды іншых імпрэзаў, ладжаных аддзелам, можна даведацца, наведаўшы ўэбстаронку **www.baza-belarus.org***

### Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні* :

| | |
|---|---|
| С. Арыфуліна | 30 |
| К. і М. Верабей | 30 |
| А. Гусак | 30 |
| А. Грошаў | 30 |
| С. Крутаўцоў | 30 |
| В. Крэмез | 30 |
| А. Кузьміч | 30 |
| Н. Піваварчык | 30 |
| М. Цiхановiч | 30 |

**Шчыры дзякуй!**

*Паважаныя **В. Бабіч, В. Скрыпская, М. Запольскі** паведаміце рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы ў рэдакцыю аплату гадавой падпіскі (**$30**). Чэкі выпісвайце на імя **Belarusan American Association**.*

*Рэдакцыю бясплатна надрукуе прыватныя некамэрцыйныя абвесткі, а таксама будзе ўдзячная за дасланыя водгукі й лісты.*

*Допісы ў рэдакцыю накіроўвайце на адрас:*
***VIESTKI***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***
*альбо на адрас электроннай пошты:*
***viestki@mail.com***

*У сеціве электронны варыянт бюлетэня можна знайсьці па адрасу:* ***www.e-krama.com***